

ЦУКАР — ЗАБОЙЦА? 7

У КІТАІ ПАЧАЎСЯ ГОД ДРАКОНА 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛЮТАГА 2024 г. СУБОТА № 29 (30163)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КУЛІК, міністр лясной гаспадаркі:**

*«У 2023 годзе ў гадавальніках вырашчана больш за 400 млн штук стандартнага пасадачнага матэрыялу, а таксама звыш 200 відаў і форм драўняных раслін. Па падліках, у гэтым годзе нам спатрэбіцца больш за 170 млн раслін для правядзення лесакультурных работ. Гэта звычайная хвоя, еўрапейская елка, павіслая бяроза, чаранкаваты дуб. Лясгасы Беларусі ў цэлым забяспечаны пасадачным матэрыялам».*

# Калі ажываюць... маркі





У руках Кацярыны ЛЯШКОВАЙ, інжынера цэнтра арганізацыі аказання паслуг вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта», — філатэлістычны набор «AR MARKA BELARUS». Тут справа не толькі ў адмысловых марках, а ў мабільным дадатку з такой назвай. Пры навядзенні на паштовыя блокі і маркі камеры гаджэта з запушчаным дадаткам AR MARKA BELARUS малюнак на марцы ажывае, з'яўляецца спецыяльна створаны сцэнарый у дапоўненай рэальнасці. Дадатак AR MARKA BELARUS прымяняецца да паштовых марак «Старажытныя паштовыя маршруты», «Залатая птушка» і «Купалле», да паштовых блокаў, прысвечаных 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 1000-годдзю з часу першай пісьмовай згадкі Брэста, а таксама да паштовага блока «Каложская ікона Божай Маці». Філатэлісты будуць задаволеныя.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Аб'яўлены прыём заявак на ўдзел у Міжнароднай бізнес-прэміі «Лідар года 2024».**
- У 2023 годзе Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў папоўніўся 24 аб'ектамі.
- **МЭТЗ імя В. І. Казлова асвоіў серыйны выпуск трансфарматараў для аэрадромнага абсталявання.**
- «Бархім» запусціў абноўлены цэх па выпуску вадкіх мыйных сродкаў.
- **У 2024 годзе запланавана рэстаўрацыя Акадэміі музыкі і тэатра імя М. Горкага. Зацверджаны парадак бясплатнага забеспячэння прэпаратамі, якія не ўваходзяць у Рэспубліканскі фармуляр лексродкаў.**



- «Белтэлекам» папярэджвае аб работах на сетцы эфірнага ТБ і радыё 12—16 і 19—23 лютага.

ISSN 1990 — 763X

Соцыум

## ПРАГУЛКА Ў БУРШТЫНАВЫМ ПАКОІ І СОН НА ВУЛЛЯХ

### Якія медыцынскія кірункі карыстаюцца попытам у замежнікаў, і чаго яны чакаюць ад нашых санаторыяў?

**Замежнікі, якія прыязджаюць у нашу краіну папраўіць здароўе, у асноўным робяць гэта па такіх кірунках, як кардыялогія, анкалогія, афтальмалогія, хірургія і нейрахірургія. Традыцыйна карыстаюцца попытам стаматалагічныя паслугі. А вось найбольш сродкаў медыцынскі турызм прыносіць па такіх галінах, як транспланталогія і гематалогія, а таксама пластычная хірургія.**

Беларускія санаторыі карыстаюцца попытам у нашых суседзяў даўно. Праўда, сёння мяняецца аўдыторыя здраўніц і, адпаведна, патрабаванні да іх. Таму ў многіх санаторыях сёння ўмовы імкнуцца прывесці да сусветных стандартаў гасціннасці. Ужо недастаткова дыетычнага харчавання, наведвальнікі жадаюць шведскі стол, і аднымі медыцынскімі працэдурамі не абмежавацца: санаторыі будуюць асобныя СПА- і велнес-цэнтры. Што жадаюць бачыць медыцынскія турысты, і наколькі гэта супадае з магчымасцямі айчыннай медыцыны і санаторна-аздараўленчых устаноў, расказалі спецыялісты. СТАР. 4

Міласэрнасць

## ПРЫТУЛАК ДЛЯ ТЫХ, ХТО АПЫНУЎСЯ Ў БЯДЗЕ

**Сужэнцы з Індыі Сінгх Мастан і Каур Гурджэй трапілі ў Магілёў не падчас падарожжа. Іх разам з маленькай дачкой Керам прывяло сюды цяжкае жыццёвае становішча. Пакуль вырашаецца пытанне з аднаўленнем іх дакументаў, яны жывуць у сценах крызіснага цэнтра Магілёўскага аддзялення Чырвонага Крыжа. І ўдзячныя добрым людзям, што не кінулі іх у бядзе.** СТАР. 5



Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.